УДК 728.82(476)
С 128

# АРХІТЭКТУРА ЗАМКАЎ НА БЕЛАРУСІ Ў І ПАЛОВЕ XVII СТАГОДДЗЯ

**Савельеў З.В.**
магістр гісторыі, спецыяліст па ахове спадчыны, галоўны архітэктар праектаў
ТАА "Цэнтр па рэгенерацыі гісторыка-культурыных ландшафтаў і тэрыторый"

*У артыкуле прааналізавана архітэктура замкаў на тэрыторыі Беларусі канца XVI- пачатку XVII стагоддзя ў кантэксце замкавай архітэктуры Рэчы Паспалітай.*

Пераломным момантам у будаўніцтве феадаламі замкаў трэба лічыць увядзенне ў шырокае выкарыстанне новай абарончай стратэгіі ў сувязі з далейшым развіццём сродкаў вядзення вайны. Заканчэнне зацяжной вайны Рэчы Паспалітай з Масковіяй 1558-1583, дзе ў фартыфікацыі шырока выкарыстоўваліся заходнія прыёмы ўзвядзення бастыённых умацаванняў, якія часам дапаўняліся традыцыйнымі драўляна-землянымі канструкцыямі (крэпасці Івана Жахлівага ў Паддзвінні), а таксама ўдзел саміх прадстаўнікоў сярэдніх і вышэйшых слаёў грамадства ў замежных вайсковых дзеяннях, паказаў эфектыўнасць бастыённых умацаванняў. Да таго ж новы стыль жыцця феадалаў у заходніх краінах з прэзентацыяй свайго багацця і раскошы, патрабаваў у мясцовым архаічным асяроддзі будаўніцтва больш прыстасаванага для такога жыцця новых будынкаў.

Замак у сучасным разуменні, як тып жылля феадала, у другой палове XVI стагоддзя трансфармаваўся ў палацава-замкавы комплекс, дзе абарончыя функцыі рэзідэнцыі феадала выносіліся на знешнюю тэрыторыю ў выглядзе асобных канструкцый і збудаванняў. Найбольшы распаўсюд такога тыпу бяспечнага жылля феадала атрымаў тып "palazzo in fortezza", або "палацава-замкавая архітэктура", які аднак адлюстроўвае хутчэй тып рэзідэнцый, якія быліператвораны з фартыфікаваных палацаў у палацавы комплекс у канцы XVII- XVIII стагоддзі. З'яўленне гэтага тыпа жылля сярод феадалаў трэба адносіць да часоў праўлення Стэфана Баторыя, а шырока ўваходзіць у моду як новы тып пры праўленні дынастыі Вазаў. Трэба аднак дапусціць, што адным з першых вядомых будынкаў па тыпу "palazzo in fortezza" верагодна быў палац на гарадзішчы ў Рагачове, збудаваны за часамі апошніх Ягелонаў і рэканструкцыю якой зрабіў М.Шчакаціхін, аднак гэтая інфармацыя патрабуе дадатковай праверкі.

Будаўніцтва новага тыпу рэзідэнцыі па ўзорам французкіх, гішпанскіх і італьянскіх палацаў за часамі Вазаў, паслужыў вельмі своечасовы пажар на Вавельскім замку ў Кракаве ў 1595 годзе, пасля чаго пачалася яго перабудова, і адначасова вымушанае падарожжа каралеўскага двара да Варшавы. Любімая рэзідэнцыя папярэдняга караля Стэфана Баторыя ў Гародні не прыйшлася да густаў Жыгімонта Ваза, а таму спыненне каралеўскага двара ў Варшаве на паўдарозе да другой сталіцы федэратыўнай дзяржавы Вільні (а магчыма і бліжэй да порта ў Гданьску для адначасовага кіравання Шведскім Каралеўствам) сталася фактычным пераносам сталіцы і запатрабавала будаўніцтва ў Варшаве новай рэзідэнцыі на месцыстарога замка мазавецкіх уладароў і пабудовы на новым месцы іншых рэзідэнцый для шматлікага двара і найбольш уплывовых асоб дзяржавы. Усё гэта стала адпраўной кропкай фарміравання новай архітэктуры эпохі Вазаў у палацава-замкавай архітэктуры.

Вялікі ўплыў на густы Жыгімонта Вазы безумоўна аказваў так званы радавы стыль "Ваза-Рэнесанс", што ўзнік у Швецыі пад ўплывам архітэктараў з тэрыторый сучаснай Германіі, Францыі, Нідэрландаў пасля ўзыхода на шведскі трон дзеда Жыгімонта Вазы- Густава І Ваза і яго наступнікаў Эрыка XIV і Ёхана

III (бацькі Жыгімонта) [1, с. 32]. А таму формы нідэрландскага маньерызму, якія з’явіліся ў архітэктуры Польшчы яшчэ з 1560 гадоў [2, с. 107], пры новай каралеўскай дынастыі атрымалі новы штуршок для больш шырокага распаўсюду.

Асабліва актыўна будаўніцтва палацава-замкавых комплексаў феадаламі ў новым стылі вялося з пачаткам XVII стагоддзя і мела шмат агульнага з архітэктурай паўночнай і паўночна-заходняй Еўропы.

На тэрыторыі Вялікага княства Літоўскага феадаламі быў збудаваны шэраг палацава-замкавых комплексаў у Гальшанах, Заслаў’і, Быхаве, Гародні, Біржах, Смалянах, Ружанах, Ляхавічах, Чырвоным Двары, Сесішках, Панямонні. Некалькі замкаў было збудавана ў Вільні і наваколлі, як напрыклад у Нарвілішках, Раканцішках, падвіленскім Замачке. Але застаецца шэраг замкаў на дадзены момант або зусім не даследваных, або даследваны не дастаткова, у тым ліку дэкаратыўнае аздабленне інтэр’ераў. Тым ня менш, палацава-замкавыя комплексы, што захаваліся да нашага часу, або вядомы з археалагічных і гістарычных крыніц, маюць шмат агульных рысаў паміж сабой і з замкавымі комплексамі суседніх рэгіёнаў Польшчы, Літвы, Украіны, Расіі, з чаго можна выявіць пэўныя тыпалагічныя схемы, або нават вызначыць этапы будаўнічай гісторыі.

Новым галоўным тыпам палацава-замкавага будынка ў канцы XVI у цэлай Рэчы Паспалітай стаў тып простакутнага будынка з двума блокамі апартаментаў па баках цэнтральнай часткі, якая часам завяршалася вежай [3, с. 290]. Па кутах таксама маглі размяшчацца невялікія вежачкі. Такія будынкі ці хутчэй палацы з рудыментамі замкавай архітэктуры мелі як традыцыйныя драўляныя фартыфікацыі, так і адпаведна свайму часу бастыённыя ўмацаванні. Да гэтага тыпу належыць пераважная большасць беларускіх замкаў, пачынаючы ад непасрэдна праектаваных замежнымі архітэктарамі як напрыклад замкі нідэрландскага архітэктара Пітэра Нонхарта, што працаваў у Вільні, яго замак-палац на Антокалі [4, с. 10] і Гайцюнішках, так і замкі, аўтарства якіх невядома, але відавочны моцныя заходнія традыцыя, як тое ёсць у замках у Смалянах, Быхаве, Нарвілішках, Гальшанах, Нясвіжы.

У дэкаратыўным аздабленні палацава-замкавых комплексаў моцны распаўсюд атрымлівае акуццёвы арнамент. Тым больш, што адзін з выбітных архітэктараў, тэарэтыкаў архітэктуры і стваральнікаў альбомаў архітэктурных узораў таго часу Ханс Вредэрман дэ Врыс (Hans Vredeman de Vries) працаваў у Гданьску, як і гданьскі фарыфікатар Антоні ван Оберхен, стваральнік гданьскай збраёўні, замка Віславусце і замка ў Кострыне над Одэрам. Таксама важнай характэрнай рысай Ваза-Рэнесанса было выкарыстанне адкрытай цаглянай муроўкі з расшыўкай швоў і ўстаўкамі з перапаленай цэглы (клінкера) або камянёў (Быхаў, Гайцюнішкі, Гальшаны, Ружаны).



Мал. 1. Муроўка сцен палацавай часткі палацава-замкавага комплекса Сапегаў у Быхаве з выкарыстаннем клінкера (фота аўтара, 2012 г.)

Кампазіцыя фасада часам не мае абавязковай сіметрыі (Смаляны), што звязана з гісторыяй паўстання стылістыкі Паўночнага Рэнесанса, як абнаўленне старых гатычных пабудоў. Вежа ў такіх новых будынках мае як сімвалічнае значэнне ўвасаблення моцы феадала, падкрэслівае значнасць яго ўладанняў у

навакольным асяроддзі горада або вёскі, так і практычнае: там маглі знаходзіцца сходы, кабінеты, прыбіральні, а таксама пляцоўкі для сачэння за войскамі і агляданне навакольнага пейзажу, замкавыя капліцы. Важнае значэнне мела будаўніцтва на тэрыторыі палацава-замкавага комплексу асобнай культавай пабудовы, якая пазней магла стаць дамінуючай у межах фартыфікацыйных збудаванняў (Заслаў'е, Біржы, Гальшаны).

Як асобны тып можна разглядаць замкі-палацы, што сталі далейшым развіццём галоўнага тыпу. Такі тып ня мае вежаў, але атрымаў трох-восевае развіццё галоўнага фасада з моцна развітымі бакавымі рызалітамі і параднай галерэяй на галоўным фасадзе паміж рызалітамі. Рызаліты завяршаліся франтонамі са складаным акуццёвым арнаментам, які пазней мог быць зменены на завяршэнне ў французкім стылі. Да гэтага тыпу трэба аднесці замкавы палац у Ляхавічах і Біржах, а таксама палац Радзівілаў у Вільні. Першых два гэтых палацы паўсталі сярод моцных бастыённых умацаванняў фартэцый.




Мал. 2. Схемы тыпаў палацаў
у палацава-замкавых комплексах
(1 – Нясвіж, 2 – Антокаль,
3 – Гайцюнішкі, 4 – Смаляны, 5 – Ляхавічы)

Некаторыя з замкаў, што будаваліся ў папярэдні перыяд праўлення апошніх Ягелонаў і першых элекцыйных уладароў, у далейшым пры шведскай дынастыі Вазаў перабудоўваліся ў новым гусце. Прыкладам з'яўляецца замак у Любечы, першая частка якога збудавана ў апошняй чвэрці XVI стагоддзя ў рысах італьянскага рэнесанса (як і перабудаваны Стары замак Стэфана Баторага ў Гародні), у далейшым атрымаў новую стылістыку Ваза-Рэнесанса, і ператваўся ў тыповую рэзідэнцыю феадала для адпачынку і паляванняў, што вельмі падобны да шведскага замка Экенес, пры гэтым захоўваючы прынцыпы абарончай архітэктуры папярэдняга часу.

Калі першыя дзесяцігоддзі праўлення Вазаў звязаны з рэнесансам, то паступова ў архітэктуры новых каралеўскіх фундацый ідзе адыход ад рэнесанса і больш актыўна выкарыстоўваецца стылістыка барока, што, аднак, ужо мае падмурак у некаторых з замкаў на тэрыторыі Беларусі. Але гэта новае барока атрымлівае свае асаблівасці і часам такое барока называюць Вазаўскім Барока. Узорамі для стварэння архітэктуры гэтага трэцяга тыпу непасрэдна "вазаўскіх палацаў" з перпендыкулярна-восевай структурай з'яляліся італьянскія загарадныя вілы, у прыватнасці неапальская віла Поджо Рэале (Villa di Poggioreale) па праекту Себасцьяна Серліо [5, с. 132], а таксама найлепшыя рымскія палацы таго часу: сіметрычнасць кампазіцыі фасада і плана, фланкуючыя чатырохкутныя вежачкі, выкарыстанне карычневых і чырвоных колераў, парадная лесвіца, якая часам з'яўляецца цэнтрам кампазіцыі палаца ці замка, кампазіцыйны акцэнт на вежы са складаным купальным завяршэннем. У пластыцы фасадаў шырока выкарыстоўваецца архітэктурны ордэр з абрамленнем вакнных і дзвярных праёмаў, выкарыстанні сандрыкаў, пілястраў, руста, падзел паверхаў праз ужыванне карнізаў.

Трансфармацыю каралеўскіх густаў выразна можна прасачыць пры разглядзе гісторыі будаўніцтва каралеўскага замка ў Варшаве, а таксама на прыкладзе Ніжняга замка Вялікіх князёў Літоўскіх у Вільні, што за часамі Вазаў пасля пажару 1610 года быў спачатку перабудаваны ў стылі Ваза-Рэнесанс, а пасля 1624 года ў стылі Вазаўскага барока адразу пасля заканчэння асноўных прац на варшаўскім замку.

У Варшаве для патрэб караля будаваліся палац Казіміра, Каралеўская Віла (Willa Regia) на Кракаўскім Прадмесці, замак Уяздоўскі, а таксама замкі ў Сахачэве і Лобзаве.

Аб каралеўскіх фундацыях замкаў у сучасных межах тэрыторыі Беларусі нам практычна нічога не вядома з прычыны малай даследванасці гэтай тэмы. Адзінымі аб'ектамі, што можа быць прыналежнымі да Вазаўскага Барока, можна аднесці няіснуючыя палацы ў Магілёве і на Гарадніцы ў Гародні. Першы з іх вядомы з малюнка пачатку XVIII стагоддзя, другі з інвентару.



Мал. 3. Казіміраўскі палац у Варшаве (крыніца: Jolanta Putkowska Królewska rezydencja na przedmieściu Warszawy w XVII wieku / Kwartalnik architektury i urbanistyki, t. XXIII, z.4, 1978. С.294)

Вядомая выява Магілёва з пачатку XVIII ст. паказвае даволі значнае збудаванне ў цэнтры магілёўскага замка. Выказвалася меркаванне, што гэта прыдуманае мастаком збудаванне, якое ніколі ня існавала у натуры [6, с. 53]. Аднак падаецца малаверагодным жаданне мастака палепшыць панараму горада, бо звычайна змяняліся прапорцыі найбольш важных пабудоў, але не сам факт існавання. Між тым архітэктура гэтага збудавання нагадвае тыповыя для II чвэрці XVII стагоддзя "вазаўскія замкі", а таму адсутнасць апісання такога палаца ў інвентары 1604 года абсалютна абгрунтавана. З улікам таго, што Магілёў з'яўляўся адной з буйнейшых у Вялікім княстве Літоўскім каралеўскай эканоміяй, то будаўніцтва такога замка можа быць цалкам верагодным. У замку маглі размяшчацца як пакоі, дзе кароль мог спыняцца пад час візітацый, так і канцэлярыя каралеўскай эканоміі.

На малюнку мы бачым трохпавярховы цагляны будынак з чатырохпавярховымі вежамі шасцікутнымі па рогах з купаламі і сігнатуркамі і пяцікутнай надбрамнай са складаным шатрова-купальным завершам. Паверхі замка падзелены карнізамі паміж сабой. Завершаны будынак двухсхільным дахам з чатырмя мансарднымі вокнамі-люкарнямі. Маючы такую характарыстыку замка і вялікую колькасць аналагаў, можна зрабіць тэарэтычную рэканструкцыю плана. Па памеры гэта мог быць прыкладна 60Х40м з невялікім адкрытым унутраным дваром з аркадай.



Мал. 4. Палацава-замкавы комплекс у Магілёве. Рэканструкцыя плана

Вельмі блізкую планіровачную структуру з арганізацыяй жылых і прадстаўнічых пакояў вакол унутранага

двара меў замак у каралеўскім маёнтку ў прадмесці Гарадніца. Замак вядомы адзіна толькі па інвентару 1653 года, які надрукаваў Ю. Якімовіч і зрабіў тэарэтычную рэканструкцыю яго плана [7, с. 94-96]. Зыходзячы з гэтага можна зрабіць высновы, што замак быў аднапавярховым драўляным збудаваннем з унутраным дваром, які быў перакрыты дахам і меў другое асвятленне па абрысе канструкцыі даха для асвятлення ўнутранага двара. Кожны з чатырох фасадаў меў скразны праход ва ўнутраны двор.

Памяшканні замка былі анфіладнымі і складаліся з жылых пакояў і антыкамер. Шмат якія з пакояў мелі печы або каміны. Тэрыторыя вакол замка была добра распланавана з арганізацыяй італьянскага саду, сажалкі. Існаваў шэраг іншых пабудоў: флігеля, розныя гаспадарчыя будынкі. Такім чынам гэты замак вельмі нагадваў тыповы загарадны палац для адпачынку. Але такая планіровачная структура навязвае да ўплыву архітэктуры італьянскіх віл XVI стагодзя з іх ідэальнай сіметрыяй і праяўленні абсалютызму і ідэалістычнай гармоніі, што павінна было падкрэсліць асаблівасць каралеўскай улады.

Ідучы за каралеўскім густам, а часам і з развіццём патрэбаў, ідзе трансфармацыя і ўскладненне планіровачнай структуры палацава-замкавых комплексаў найбольш заможных феадалаў.

Адзін з такіх замкаў — гэта замак ў Гальшанах. Замак будаваўся ў некалькі этапаў. Самым першым быў кавалак паўночна-заходняга корпусу, збудаваны ў канцы XVIст., да якога пазней быў прыбудаваны астатні кавалак з нарожнай вежай [8, с. 151]. На трэцім апошнім этапе замак атрымаў перпендыкулярна-восевую кампазіцыю з унутраным дваром. Як і ў іншых замках, даследчыкамі (у прыватнасці І. Чарняўскім) былі выяўлены ўжыванне клінкернай цэглы, а Д. Бубноўскі ўстанавіў, што яна мела расшыўку швоў. Усё гэта кажа пра ўплыў галандскага маньерызма. Нам на жаль пакуль нічога не вядома ці меў замак на першым этапе які-небудзь абарончыя ўмацаванні і іх лёс пры разбудове замка.



Мал. 5. Палацава-замкавы комплекс
на Гарадніцы ў Гародні (крыніца:
Якимович, Ю. А. Зодчество Белоруссии XVI —
середины XVII в. : справочное пособие / Ю. А.
Якимович; [Управление культуры Витебского
облисполкома]. – Минск : Навука і тэхніка, 1991.)

Шэраг замкаў таксама пры далейшай разбудове атрымліваў амаль ідэальную перпендыкулярна-восевую структуру.
У Нясвіжы пры разбудова палацава-замкавага комплекса ўнутры бастыённых умацаванняў і быў створаны адзін вялікі галоўны ўнутраны замкнёны двор і 2 маленькіх. Важна адзначыць, што будаўніцтва палацавай часткі замка Радзівілаў у Нясвіжы адбывалася ад 1583 года ў стылі італьянскага рэнесанса з рысамі нідэрландскага маньерызму. Палацавая частка замка вельмі падобная на брамныя комплексы, якія прыводзіць Джыралама Мажы (Girolamo Maggi) у трактаце 1564 года па фартыфікацыі, дзе кожная курціна бастыённых умацаванняў мусіць мець браму ў выглядзе малога чатырохкутнага замачка з 4 вежамі.

Але ў Нясвіжы архітэтар творча перапрацваў падобныя ідэі, і кожны бок курціны таксама займеў сваё пэўнае збудаванне, хаця цэнтральную ролю

займеў галоўны палацавы будынак замка: амаль квадратны ў плане з вежачкамі па рагах з падзелам квадратнага аб’ема на тры папярэчныя асноўныя часткі з дадатковым падзелам на прадольныя і стварэнні анфілады памяшканняў. Падобны план палацаў у Польшчы з’явіцца толькі бліжэй да сярэдзіны XVII стагоддзя (палацы Асалінскіх у Варшаве [9, с. 210], каралевіча Караля Фердынанда Вазы на паўночным бастыёне Каралеўскага замка, збудаваны ў 1640-х гг.) у барочных формах, а таму з’яўленне гэтага тыпу ў Нясвіжы яшчэ ў рэнесансных формах з’ява выключна важная.




Мал. 6. Палацава-замкавы комлекс у Гальшанах. Рэканструкцыя будаўнічых этапаў

Па такому ж шляху, як і ў Гальшанах і Нясвіжы ішла разбудова замка ў Ружанах, якая, аднак разцягнулася амаль на 2 стагоддзі, дзе на першым этапе паўстаў палац сярод земляных умацаванняў і паслядоўна ішло развіццё комплекса, якое завяршылася ў апошняй трэці XVIII стагоддзя, калі моцна перабудаваны палац разам з нанова збудаванымі флігеліямі і брамным комплексам быў аб’яднаны класіцыстычнай аркадай.

*Высновы.*Тып замкавай архітэктуры, які з’явіўся ў архітэктуры Беларусі ў канцы XVI- I палове XVII стст. пры праўленні шведскай дынастыі Вазаў у сувязі з распасюджваннем бастыённай фартыфікацыі атрымаў назву палацава-замкавай архітэктуры, дзе жылая частка замка аддзялілася ад абарончай функцыі і атрымала палацавыя рысы, характэрныя на пачатку праўлення Вазаў для Ваза-Рэнесанса, а ў далейшым для Вазаўскага Барока, што ішло ў плыні з архітэктурай цэлай Рэчы Паспалітай. Гэты перыяд стаў апошнім у развіцці замкавай архітэктуры Беларусі і саступіў палацавай.

*Литература:*

2. *Каптиков Анри, Богданова Дарья Королевские замки и дворцы Швеции. Ваза-Ренессанс. Каролинское барокко. Густавианский классицизм.- Екатеринбург: TATLIN, 2013.*

3. *Kozakiewiczowa, Helena. Renesans i manieryzm w Polsce / Helena Kozakiewiczowa. Warszawa : Wydawnictwa Artystyczne i Filmowe : "Auriga", 1978.*

4. *Dzieje sztuki polskiej. T. 4, Sztuka polska XVII wieku. Cz. 1, Architektura polska XVII wieku / napisał Adam Miłobędzki ; [wstęp Elżbieta Gieysztor-Miłobędzka] ; kom. red. Władysława Jaworska [et al.].*

5. *Janoniene, Rūta Sapiegų rūmai Antakalnyje / Rūta Janonienė, Evaldas Purlys ; [vertėja į lenkų kalbą Beata Piasecka, vertėjas į anglų kalbą Ramūnas Kondratas] ; Nacionalinis muziejus Lietuvos Didžiosios Kunigaikštystės valdovų rūmai, Vilniaus dailės akademija. Vilnius : Nacionalinis muziejus Lietuvos Didžiosios Kunigaikštystės valdovų rūmai : Vilniaus dailės akademija, 2012.*

6. *Ulatowski, Kazimierz Architektura włoskiego renesansu / Kazimierz Ulatowski. Poznań : Państwowe Wydawnictwo Naukowe, 1964. Wyd. 2 rozsz.*

7. *Марзалюк, І. А. Магілёў у XII-XVIII стст. : Людзі і рэчы / Гуманітар.-экан. недзярж. ін-т. - Мн. : ЗАТ "Веды", 1998.*

8. *Якимович, Ю. А. Зодчество Белоруссии XVI — середины XVII в. : справочное пособие / Ю. А. Якимович; [Управление культуры Витебского облисполкома]. - Минск : Навука і тэхніка, 1991.*

9. *Чарняўскі, І. Гальшанскі замак // Археалогія і нумізматыка Беларусі. Энцыклапедыя. Мн., БЭ, 1993.*

10. *Dzieje sztuki polskiej. T. 4, Sztuka polska XVII wieku. Cz. 1, Architektura polska XVII wieku / napisał Adam Miłobędzki ; [wstęp Elżbieta Gieysztor-Miłobędzka] ; kom. red. Władysława Jaworska [et al.].*

## THE CASTLES ARCHITECTURE IN BELARUS IN THE I HALF OF XVII C.

***Savelyeu Zmitser***
**Center for the regeneration of historical and cultural landscapes and territories**

The article analyzes the architecture of castles in Belarus late XVI- early XVII century in the context of castle architecture of the Rech Pospolita.

*Поступила в редакцию 17.02.2016 г.*

УДК 72 (476)

# АРХИТЕКТУРА АКАДЕМИИ: ПРЕЕМСТВЕННОСТЬ И РАЗВИТИЕ

**Сардаров А.С.**
доктор архитектуры, профессор, декан архитектурного факультета БНТУ
**Башаримова Т.В.**
заведующая "Архитектурно-инновационного центра"
ф-ла БНТУ "Научно-исследовательская часть"

*Архитектура Национальной академии наук прошла долгий путь эволюции, связанный с историческими и культурными изменениями в стране. Данная статья, посвященная этой эволюции, подготовлена по результатам научно-исследовательских работ, выполненных при проектировании универсального конференц-зала Национальной академии наук Беларуси Архитектурно-инновационным центром филиала БНТУ "Научно-исследовательская часть" в 2015 году*

*Введение.* Одним из архитектурных символов столицы Беларуси является здание Президиума НАН (проспект Независимости, 66), которое является доминантой в "академическом квартале", ограниченном пр. Независимости, ул. Сурганова и ул. Академической. Формирование этой территории было осуществлено в советский период нашей истории и заняло около 80 лет (с 20-х годов XX века до начала XXI века). Эволюционные изменения архитектурно-планировочной системы здесь тесно связаны с социально-политическими, экономическими и культурными изменениями в обществе.

*Основная часть.* Активное градостроительное развитие данной территории города Минска было начато в 20-е годы прошлого века. В 1926 г был разработан проектный план (под руководством В.Семенова и Н.Полякова), предусматривающий радиальное развитие города от центра Минска. Одним из приоритетных направлений градостроительного развития было выбрано направление на г. Москву (Борисовское направление). Здесь на ул. Пушкинской (первоначально - Борисовский тракт) были предусмотрены, а впоследствии построены в 20-е – 30-е годы комплексы Клинического городка, Политехнического института, Дома печати, Белорусской Академии.

Постановлением ЦИК и СНК БССР от 13 октября 1928 г на базе Инбелкульта создана Белорусская академия наук. На основании результатов конкурсов на проектирование главного здания Академии в г. Минске, был отобран проект известного белорусского архитектора Г.К. Лаврова. В 1932 г началось строительство комплекса на улице Пушкинской (сейчас пр. Независимости).

Первоначальный проект здания главного корпуса Академии, выполненный архитектором Г. Лавровым с самого начала имел важнейшие качества, впоследствии ставшие определяющими для его архитектуры.

**Во-первых**, ось главного входа композиционно в плане была проведена под углом 45° к оси улицы Пушкинской, главной магистрали в этом районе г.Минска.

**Во-вторых**, комплекс зданий для Академии объединялся в центре архитектурной композиции сегментным в плане, четверть-циллиндрическим объемом.

**В-третьих**, сегментный объем фланкировался двумя симметричными блоками, прямоугольными в плане, выходящими на главный фасад своими торцами (рис. 1).

Стилистическое решение комплекса – конструктивизм, активным приверженцем которого был Г. Лавров. Этот архитектурный стиль был